Tekst jest w trakcie tlumaczenia na polski
Кожны дзень быў добра арганізаваны. Праводзіліся гутаркі па тэме дня, малітвы, песні, розныя гульні, танцы, у якіх удзельнічалі ўсе – ад малога да вялікага. Дзеці прымалі ўдзел у конкурсе малюнкаў на асфальце, у спартыўных спаборніцвах, за што атрымлівалі прызы. Кожная сустрэча заканчвалася малітвай і песнямі на Божую хвалу, а таксама падзякай за пражыты дзень.

Ва ўсім адчувалася дапамога клерыкаў і моладзі, якія калісьці таксама ўдзельнічалі ў “Канікулах з Богам” і таму выдатна ведаюць і разумеюць тую радасць, якую атрымліваюць дзеці ад такіх сустрэч. Яны прыклалі шмат намаганняў для падтрымкі і арганізацыі гэтых святочных дзён для дзяцей.

Падзякаваць за ўсё цяпло, ласку якую выпраменьваюць айцы піяры, мы змаглі ў святочны Дзень св. Юзафа Каласанса, які адзначаўся на гэтым тыдні, 25 жніўня.

Усе ўдзельнікі атрымалі сапраўднае задавальненне ад “Канікул з Богам”. Будзем чакаць наступнага года для таго, каб зноў пражыць тую радасць і ласку, якія можна атрымаць разам пад апекай Пана Бога.

*Маша Васюк*